Аляксей
Рагуля

# ЭТНАС У ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ФІЛАСОФСКА-ЭСТЭТЫЧНАЙ ДУМКІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Філасофскі пошук у нашай даведзенай да крайняга рэлятывізму сучаснасці засяроджаны часцей за ўсё на праблеме сэнсаў універсальнай эвалюцыі і чалавечага існавання ва ўмовах перманентнага татальнага крызісу бюракратычна-гандлёвага соцыуму. Многія мысляры праблему сэнсу разглядаюць у цесным яго суіснаванні з нонсэнсам, імкнуцца пашлюбаваць мову з падсвядомасцю. І на гэтым напрамку дасягнуты немалыя поспехі, у прыватнасці ў разуменні дыялектыкі сумагчымасцяў ці «мембраннай» спецыфікі сучаснага быцця — існавання на мяжы жыцця і смерці. Лічыцца, што парадаксалісцкая логіка якраз і выводзіць абрысы ў карціне чыстага станаўлення.

Беларускі філосаф Энгельс Дарашэвіч не лічыць патрэбы доўга затрымлівацца на дылеме хто каго паядае: кошкі мушак ці мушкі кошак. Яго цікавіць найперш патэнцыял пазітыўнага, матэрыялізаванага ў сацыяльных

структурах беларускага адраджэнскага і асветніцкага вопыту. Адраджэнне этнасаў да паўнацэннай гістарычнай творчасці — гэта вялікая праца, і тут не ўсё ідзе гладка. Прыходзіцца мець справу з фактамі, ці дакладней, з артэфактамі, якія не ўкладваюцца ў параметры Ідэі абсалютнага станаўлення. Некаторыя сучаснікі Гегеля якраз за гэта яго і папракалі. Гегель, аднак, не адмовіўся ад дыялектыкі руху праз супярэчнасці да гармоніі і адказаў апанентам: «Тым горш для фактаў». Можна да сказанага дабавіць: яшчэ горш для суб'екта, які дзейнічае па-за межамі дыялектыкі станаўлення. Пафас самасцвярджэння праз перадоленне супярэчнасці з'яўляецца ўласцівасцю беларускага асветніцкага руху. Філасофская лірыка Максіма Танка, напрыклад, прасякнута маральным імператывам: «калі жыцця няма — яго стварыць». І пачынаць варта з тварэння Ідэі, ці як вельмі дарэчы сказаў у свой час У. Калеснік, з «тварэння легенды».

Даследчыцкая дзейнасць Энгельса Дарашэвіча якраз і разгортваецца на гэтым напрамку — на паказе тварэння Ідэі сучасным беларускім этнасам на грунце перш за ўсё ўласнага вопыту нацыянальнага адраджэння. Характэрнай рысай філасофскага дыскурсу даследчыка з'яўляецца зацікаўленасць эстэтыка-філасофскімі пластамі беларускага Тэксту. Шмат хто з гісторыкаў культуры яшчэ не заўважыў такой прагі эстэтычна паўнацэннага існавання ў культуры «мужыцкай» нацыі. Беларускі панэстэтызм з асаблівай сілай праявіўся ў дзейнасці В. Ластоўскага і М. Багдановіча, але ён не быў ні выпадковым, ні пазычаным. У фальклоры няма рэчаў, узятых і пададзеных па-за эстэтычнай і этычнай знач-

насцю. Менавіта ў даследаваннях беларускай эстэтычнай думкі найбольш ярка праявіліся даследчыцкія здольнасці Энгельса Дарашэвіча. Варта зазначыць, што буйнейшыя мысляры дваццатага стагоддзя (М. Хайдэгер, Ж. Дэлёз) антрапалагічную праблематыку сваёй творчасці разгортвалі перш за ўсё на грунце эстэтыкі мастацкага слова, якое валодае найбольшымі магчымасцямі канстэляцыі сэнсаў у параўнанні з гукавой ці пластычнай сімволікай.

Энгельс Дарашэвіч пачынае свой шлях даследчыка з асэнсавання здабыткаў беларускай сацыяльнай філасофіі і педагагічнай думкі. Менавіта гэтыя галіны гнасеалагічнай дзейнасці ствараюць надзейную пляцоўку для тварэння філасофскай і фенаменалагічнай эстэтыкі. Час, калі пісаліся такія працы, як «Аніёл Даўгірд — мысляр эпохі Асветніцтва» (1967), «Філасофія эпохі Асветніцтва ў Беларусі» (1971), «Нарыс гісторыі эстэтычнай думкі Беларусі» (1972, разам з У. Кананам), ставіў даследчыка ў рамкі жорсткіх нарматыўных патрабаванняў. Ідэолагі пільна сачылі, каб аўтар не выйшаў за межы ілюстравання «правільнай» догмы. Паказ самаруху культурных сэнсаў у іх іманентнай вернасці сваёй прыродзе быў забаронены. І ўсё ж Энгельс Дарашэвіч здолеў паказаць самую істотную вартасць беларускай грамадскай думкі, эстэтыкі і слоўнага мастацтва — арганічную народнасць айчыннай культуры. Заадно ў яго працах паказана вялікая роля польска-беларускага рамантызму ў фарміраванні дэмакратычных тэндэнцый у філасофіі і эстэтыцы. Асобай увагі заслугоўвае цікавасць даследчыка да персаналіяў. Са старонак кнігі «Філасофская і сацыяльная думка Беларусі эпохі Асветніцтва», перавыдадзенай у 2010 г., паўстаюць волаты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

думкі, якія не спяшаліся перакрэсліць здабытак Антычнасці і прадбачліва засцерагалі ад празмернага захаплення брытанскім эмпірызмам, у якім бачылі пагрозу тэарэтычнаму пошуку ісціны. Па-новаму ў працы Э. Дарашэвіча вырысоўваецца, напрыклад, творчае аблічча Казіміра Нарбута, які ў XVIII ст. патрабаваў ад філасофіі дэманстрацыі вынікаў пошуку ісціны ў форме выразнага, структурна завершанага выказвання, каштоўнасна акрэсленага. Тэорыя суадносін паняцця, канцэпта і выказвання сёння з'яўляецца адной з самых актуальных праблем у гнасеалогіі.

Ідэя чалавечага пабрацімства ва ўтопіі І. Яленскага, прынцып натуральнасці ў эстэтыцы І. Славацкага, прынцып гістарызму і арыентацыя на працяг фальклорных традыцый у паэтыцы Л. Бароўскага — гэтыя і многія іншыя факты ў даследаваннях Э. Дарашэвіча падкрэсліваюць арыгінальны характар беларускай філасофскай і эстэтычнай думкі ў XVIII і XIX стст. Э. Дарашэвіч упершыню ў беларускім культуразнаўстве выразна акрэсліў ролю сацыяльнага ідэалу ў беларускай эстэтыцы. У аснову крытэрыяў ацэнкі сацыльнай рэальнасці М. Гусоўскага, Ф. Скарыны, Ф. Еўлашэўскага пакладзена ідэя вялікай Праўды і сапраўднага ідэалу. Ідэалы справядлівай дзяржавы-дому і шчаслівай сям'і ў мастацкай творчасці і сацыяльнай філасофіі XVI — XVII стст. маюць свае вытокі ў народнай культуры эпохі абшчыннай дэмакратыі. Каштоўнасныя сэнсы народнай культуры зарыентавалі творцаў на рэалістычнае адлюстраванне сацыяльнай рэчаіснасці. Э. Дарашэвіч пераканаўча паказаў багацце і стылявую разнастайнасць беларускага рэалістычнага пісьма ў XVI—XVII стст. Трагіка-гераічны

пафас М. Гусоўскага, медытацыі Ф. Скарыны, фальклорна-барочная стылістыка апоаедаў Ф. Еўлашэўскага пра голад, з'едлівая сатыра Ц. Камунякі, філасофскія ёмкасці «Прамоваў Русіна» пераканаўча засведчылі, што ў Беларусі палацавая народная эстэтыка дамінавала на самых перспектыўных напрамках духоўнага прагрэсу.

Э. Дарашэвіч звяртае ўвагу на істотны момант у гісторыі беларускай культуры, да гэтага часу як след не ацэнены, — на тэарэтычны ўзровень нацыянальнай думкі. У свой час У. Конан паэму «Песня пра зубра» кваліфікаваў як паэтычны трактат па эстэтыцы. Э. Дарашэвіч адзначае, што С. Будны рэзка крытыкаваў Ж. Кальвіна за яго рыгарызм і аскезу. Такая пазіцыя аднаго з буйнейшых ідэолагаў пратэстантызму пакінула свой негатыўны след у мастацкай культуры Цэнтральнай Еўропы. Мастацтва С. Будны лічыў, адзначае Э. Дарашэвіч, «люстэркам жыцця, а не боскай сутнасці». Рэнесансная канцэпцыя развівалася далей у творчасці Сімяона Полацкага, які тэарэтычна абгрунтаваў і паказаў на практыцы неабходнасць канцэнтрацыі вялікіх сэнсавых ёмкасцяў на лакальнай плошчы паэтычнай медытацыі.

Э. Дарашэвіч у якасці аб'екта даследавання выбраў перыяд, знешне не вельмі выйгрышны і яркі, але вынікам яго працы стала ісціна, да гэтага грамадству невядомая. Даследчык пераканаўча паказаў, што ў гісторыі беларускай грамадскай і філасофска-эстэтычнай думкі не было перарыву і забыцця нацыянальнай традыцыі нават у самых неспрыяльных умовах. Найбольш устойлівымі былі традыцыі, карані якіх пачынаюцца ў культуры кроўна-сваяцкага і каляндарна-земляробчага тыпаў. Не палацавае ракако, не за-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

везеная з чужых краёў звычка падмяняць рэальнае жыццё яго імітацыяй і бутафорыяй, а Праўда і Справядлівасць былі аб'ектам філасофскай і эстэтычнай рэфлексіі беларускіх дзеячаў напярэдадні вялікага прарыву рамантыкаў у народную стыхію. Пошук Праўды стаў лейтматывам беларускага адраджэнскага руху ў XIX ст.

У XX ст. на грунце папярэдняга вопыту разгортваўся адзін з ключавых матываў сучаснасці — «прайсці праз вернасць». У фарміраванні гэтага ланцуга кагнітыўнай дзейнасці нацыі ёсць трывалыя звёны Энгельса Канстанцінавіча Дарашэвіча, выкаваныя сілай даследчага інтэлекту і любоўю да Бацькаўшчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ